**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ШЫМКО ТАМАРА ІВАНАЎНА

**ОПЕРНАЯ СПЯВАЧКА, НАРОДНАЯ АРТЫСТКА БССР**

**28 КРАСАВІКА 1928 Г. – 9 КАСТРЫЧНІКА 2017 Г.**

**ФОНД № 177**

**ВОПІС № 1**

**[ад 1953]– 1978 гг.**

**МІНСК 2025**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 177**

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ Т.І. ШЫМКО | 1-14 | 1-2 |
| 1.1. | ФОТАЗДЫМКІ Т.І. ШЫМКО Ў ПАРТЫЯХ І СЦЭНАХ З ОПЕРНЫХ СПЕКТАКЛЯЎ | 1-8 | 1-2 |
| 1.2. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Т.І. ШЫМКО І ІНШ. | 9-14 | 2 |

## Прадмова

**Шымко Тамара Іванаўна** нарадзілася 28 красавіка 1928 года ў Мінску. У час вайны знаходзілася ў эвакуацыі ў горадзе Соль-Ілецк Чкалаўскай вобласці РСФСР (цяпер – Арэнбургская вобласць Расійскай Федэрацыі), у 1944 годзе вярнулася дадому. У 1952 годзе скончыла Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А.В. Луначарскага (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі) (клас В.М. Несцярэнкі). У 1952–1984 гадах – салістка ў Дзяржаўным Вялікім тэатры оперы і балета БССР (цяпер – Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр Рэспублікі Беларусь). У 1984–2005 гадах – выкладчык (дацэнт) кафедры вакала і тэорыі музыкі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага (цяпер – Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка). У 2005 годзе выйшла на пенсію[1].

Найбольш вядомыя оперныя партыі (лірычнае сапрана), выкананыя Т.І. Шымко ў Дзяржаўным Вялікім тэатры оперы і балета БССР у 1952–1984 гадах: Віялеты Валеры і Дэздэмоны (“Травиата” і “Оттело” Дж. Вердзі), Джаконды (“Джоконда” А. Панк’елі), Луізы (“Обручение в монастыре” С.С. Пракоф’ева), Манон (“Манон” Ж. Маснэ), Маргарыты (“Фауст” Ш. Гуно), Марысі і Марфачкі (“Міхась Падгорны” і “Алеся” Я.К. Цікоцкага), Таццяны (“Евгений Онегин” П.І. Чайкоўскага), Чыо-Чыо-Сан (мадам Батэрфляй) (“Чио-Чио-Сан (мадам Баттерфляй)” Дж. Пучыні), Юзэфы (“Яснае світанне” А.Я. Туранкова) і інш.

У 1963 годзе як стыпендыят ЮНЭСКА стажыравалася ў Італіі (“Ла Скала” і [Рымская опера]). З 1964 года актыўна гастралявала: выступала ў Бельгіі, ГДР, Польшчы, Румыніі, рэспубліках СССР, Францыі, ФРГ, Чэхаславакіі і інш.

У 1954 годзе атрымала званне “Заслужаная артыстка БССР”, у 1963 годзе – “Народная артыстка БССР”.

Т.І. Шымко памерла 9 кастрычніка 2017 года ў Мінску.

Дакументы Шымко Тамары Іванаўны паступілі ў БДАМЛМ ад яе самой у 1978 годзе. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 14 спраў (28 дакументаў) за перыяд [ад 1953] – 1978 гг.

Вопіс складаецца з аднаго раздзела “Дакументы Т.І. Шымко”, у які ўвайшлі 2 падраздзелы: “Фотаздымкі Т.І. Шымко ў партыях і сцэнах з оперных спектакляў” і “Творчыя дакументы Т.І. Шымко і інш.”. Справы ў падраздзелах сфарміраваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за перыяд [ад 1953] – 1978 гг.

Прадмову склала
заг. аддзела — В.Ф. Шаталава
25.04.2025

[1] Гл. дакументальны фільм “Народная артыстка Шымко” (БТ, 1978).

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 15.05.2025
№ 6

ФОНД № 177
ВОПІС № 1
[ад1953] - 1978

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ Т.І. ШЫМКО** | | | | |
| | **1.1. ФОТАЗДЫМКІ Т.І. ШЫМКО Ў ПАРТЫЯХ І СЦЭНАХ З ОПЕРНЫХ СПЕКТАКЛЯЎ** | | | | |
| 1 | Фотаздымак Т.І. Шымко ў партыі Чыо-Чыо-Сан (мадам Батэрфляй) (оперны спектакль "Чио-Чио-Сан (мадам Баттерфляй)" Дж. Пучыні, [рэж. А.М. Маралёў]), выкананай у тэатры оперы і балета БССР | [ад 1953 г.] | 1 | 1 | |
| 2 | Фотаздымак Т.І. Шымко ў партыі Таццяны (оперны спектакль "Евгений Онегин" П.І. Чайкоўскага, рэж. А.М. Маралёў), выкананай у тэатры оперы і балета БССР | [ад 1954 г.] | 1 | 1 | |
| 3 | Фотаздымак Т.І. Шымко ў партыі Маргарыты (оперны спектакль "Фауст" Ш. Гуно, рэж. У.М. Шахрай), выкананай у тэатры оперы і балета БССР | [1957-1959] | 1 | 1 | |
| 4 | Фотаздымкі Т.І. Шымко ў партыі Манон (оперны спектакль "Манон" Ж. Маснэ, рэж. Ю.П. Ужанцаў), выкананай у тэатры оперы і балета БССР | 1958 | 2 | 2 | |
| 5 | Фотаздымкі сцэн з опернага спектакля "Обручение в монастыре" С.С. Пракоф'ева (рэж. Д.М. Смоліч), пастаўленага ў тэатры оперы і балета БССР, з удзелам Т.І. Шымко ў партыі Луізы, В.Ф. Бруй-Шуляка ў партыі Дона Жэрома і [В.І. Глушакова ў партыі Антоніо] | 13 траўня і ліпень 1962 г. | 2 | 2 | |
| 6 | Фотаздымкі Т.І. Шымко ў партыі Джаконды (оперны спектакль "Джоконда" А. Панк'елі, рэж. Д.М. Смоліч), выкананай у тэатры оперы і балета БССР, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Т.І. Шымко і неўстаноўленых акцёраў | 6 снежня 1962 г. | 2 | 2 | |
| 7 | Фотаздымак сцэны з опернага спектакля "Оттело" Дж. Вердзі (рэж. Д.М. Смоліч), пастаўленага ў тэатры оперы і балета БССР, з удзелам Т.І. Шымко ў партыі Дэздэмоны і З.І. Бабія ў партыі Атэла | 3 кастрычніка 1963 г. | 1 | 1 | |
| 8 | Фотаздымкі Т.І. Шымко ў партыі Віялеты Валеры (оперны спектакль "Травиата" Дж. Вердзі, | 1969, 1971 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | рэж. Д.М. Смоліч), выкананай у тэатры оперы і балета БССР | | | | |
| | **1.2. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Т.І. ШЫМКО І ІНШ.** | | | | |
| 9 | Гастрольныя і рэпертуарная афішы з оперным спектаклем "Фауст" Ш. Гуно (Т.І. Шымко ў партыі Маргарыты) у Дзяржаўных операх у Клужы і Цімішаары (Румынія) і Тэатры оперы і балета Румынскай народнай рэспублікі (на румынскай мове) | 1959 | 4 | 4 | |
| 10 | Афішы оперных спектакляў "Отелло" і "Травиата" Дж. Вердзі (Т.І. Шымко ў партыях Дэздэмоны і Віялеты Валеры) Дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР | 1963, 1973 | 2 | 2 | |
| 11 | Гастрольная афіша з оперным спектаклем "Фауст" Ш. Гуно (Т.І. Шымко ў партыі Маргарыты) у Дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета Латвійскай ССР.<br>Рэпертуарная афіша з оперным спектаклем "Кармен" Ж. Бізэ з удзелам Т.І. Шымко ў Дзяржаўнай оперы ў Вроцлаве (на польскай мове) | 1965, 1976 | 2 | 2 | |
| 12 | Запрашэнне на творчы вечар Т.І. Шымко ў Рэспубліканскі дом мастацтваў Беларускага тэатральнага таварыства | 1978 | 1 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 13 | Буклеты "Народная артистка БССР Тамара Шимко" і "Тамара Шимко".<br>Натакта О. Маралёва са згадкай Т.І. Шымко. Выразка з газеты | 1955-1966 | 7 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 14 | Фотаздымкі Т.І. Шымко, індывідуальныя | 1969-1978 | 3 | 3 | |

У дадзены вопіс унесена 14 (чатырнаццаць)

спраў з № 1 па № 14 , 28 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонду зрабіла
заг. аддзела НТА ______________ В.Ф. Шаталава
05.05.2025

Дакументы прынялі:
заг. аддзела забеспячэння ______________ В.І. Бярэйшык
захаванасці дакументаў

"_____"____________20____ г.